УДК 392:273.2(476.5) DOI 10.52928/978-985-531-917-8-2025-109-123

# СТАРАВЕРСКІЯ ХРАМЫ ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ: ГІСТОРЫЯ БУДАЎНІЦТВА, АРХІТЭКТУРНА-ПЛАНІРОВАЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ І СУЧАСНЫ СТАН

***канд. гіст. навук, дац. У. Я. АЎСЕЙЧЫК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай, Беларусь)***
***ORCID https://orcid.org/0000-0002-6433-0039***

*Работа прысвечана аналізу стараверскай культавай архітэктуры ў паўночна-заходнім рэгіёне Беларусі. Аналізуецца гісторыя будаўніцтва храмаў, выяўляюцца іх архітэктурныя асаблівасці, характарызуецца сучасны стан культавага дойлідства. У артыкуле разгледжаны гістарычныя і прававыя аспекты стараверскага храмабудаўніцтва на беларускіх землях. Прасочана эвалюцыя заканадаўства, якое рэгламентавала дадзеную сферу. Выяўлены фактары, якія паўплывалі на функцыянаванне і архітэктурнае аблічча культавых пабудоў стараveраў.*

***Ключавыя словы:*** *стараверы, архітэктура, культавае дойлідства, храмы, этнічныя групы, Беларусь.*

# СТАРООБРЯДЧЕСКИЕ ХРАМЫ СЕВЕРО-ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ: ИСТОРИЯ СТРОИТЕЛЬСТВА, АРХИТЕКТУРНО-ПЛАНИРОВОЧНЫЕ ОСОБЕННОСТИ И СОВРЕМЕННОЕ СОСТОЯНИЕ

***канд. ист. наук, доц. В. Е. ОВСЕЙЧИК***
***(Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой, Беларусь)***

*Работа посвящена анализу старообрядческой культовой архитектуры в северо-западном регионе Беларуси. Анализируется история строительства храмов, выявляются их архитектурные особенности, характеризуется современное состояние культового зодчества. В статье рассмотрены исторические и правовые аспекты старообрядческого храмостроения на белорусских землях. Прослежена эволюция законодательства, регламентирующего данную сферу. Выявлены факторы, повлиявшие на функционирование и архитектурный облик культовых строений старообрядцев в указанный период.*

***Ключевые слова:*** *староверы, архитектура, культовое зодчество, храмы, этнические группы, Беларусь.*

# OLD BELIEVER CHURCHES OF NORTHWESTERN BELARUS: HISTORY OF CONSTRUCTION, ARCHITECTURAL AND PLANNING FEATURES AND CURRENT STATE

***U. AUSEICHYK***
***(Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk, Belarus)***

*The work is devoted to the analysis of Old Believer religious architecture in the northwestern region of Belarus. The history of temple construction is analyzed, their architectural features are revealed, and the current state of religious architecture is characterized. The article examines the historical and legal aspects of Old Believer temple construction in Belarusian lands. The evolution of legislation regulating this area is traced. The factors that influenced the functioning and architectural appearance of Old Believer religious buildings in the specified period are identified.*

***Keywords:*** *Old Believers, architecture, religious buildings, temples, ethnic groups, Belarus.*

Стараверская супольнасць з'яўляецца неад'емнай часткай этнакультурнага ландшафту Паўночна-Заходняй Беларусі. За больш чым трохсотгадовы перыяд пражывання на гэтых землях сфарміравалася ўнікальная этнаканфесійная група з адметнымі культурнымі традыцыямі. Стараверскае храмабудаўніцтва на беларускіх землях з'яўляецца цікавым і ўнікальным феноменам. На яго фарміраванне і развіццё аказалі ўплыў разнастайныя фактары (рэлігійныя асаблівасці стараверства, традыцыі народнага дойлідства перасяленцаў з Расіі, прыроднае асяроддзе і спецыфіка мясцовага ландшафту, матэрыяльны дастатак абшчыны і інш.). Да іх ліку адносяцца і прававыя нормы, якія рэгламентавалі функцыянаванне стараверскіх храмаў. На працягу ўсяго перыяду пражывання старавераў на беларускіх землях іх культавая сфера (у т.л. і іх храмы) па-рознаму рэгламентавалася з боку дзяржавы. Усё гэта істотна паўплывала на колькасць храмаў, іх дзейнасць, архітэктурныя асаблівасці і інш.

Умовы пражывання старавераў у другой палове XVII – XVIII ст. у Рэчы Паспалітай выгадна адрозніваліся ад Расійскай дзяржавы. Яны мелі магчымасці без абмежаванняў будаваць свае культавыя храмы. У шэрагу навуковых і навуковапапулярных публікацый, прысвечаных стараверству Паўночна-Заходняй Беларусі, сустракаецца меркаванне, што першыя храмы былі пабудаваны ў рэгіёне яшчэ ў канцы XVII – пачатку XVIII ст. Гэтыя даныя ўпершыню ўвеў у навуковы дыскурс літоўскі даследчык Г. Паташэнка [22]. Аднак, гэтае меркаванне зусім неабгрунтаванае, а крыніцы, на якіх яно пабудавана, зусім познія і, відавочна, наўмысна скажоныя [18]. На вялікі жаль, у гістарычных крыніцах гэтага перыяду пакуль не выяўлены звесткі аб стараверскіх храмах у рэгіёне. Пры гэтым зусім не адзначае, што іх у рэгіёне не было. Улічваючы факты ранніх пасяленняў старавераў на разглядаемай тэрыторыі, іх наяўнасць больш чым верагодная.

Аб колькасці і месцах размяшчэння стараверскіх храмаў у другой палове XVIII ст. маецца таксама вельмі мала звестак. Так, пры апісанні Іказненскай парафіі падчас візітацыі 1783 г. паведамлялася аб наяўнасці тут "дамоў для малення" ("domy po wsiach do modlenia"), асабліва ў в. Зачарэўе (сучасны Міёрскі раён) [25, p. 298]. У канцы XVIII і першых двух дзесяцігоддзях XIX ст. у крыніцах сустракаецца некаторая інфармацыя аб стараверскіх храмах у рэгіёне. Дакладна пацверджана, што на мяжы XVIII і XIX ст. быў пабудаваны храм у Відзах [18]. У 1820-х гг. упамінаецца пра стараверскі малітоўны дом каля маёнтку Палессе ў Завілейскім павеце (з 1842 г. павет стаў называцца Свянцянскім) [27, f. 380, ap.121, b. 140, l. 6, l.16r]. Па ўсёй верагоднасці, тут гаворка вялася пра Апідамскі храм (сучасны Пастаўскі раён). Як пабудаваны да 1826 г. згадваецца храм у Кублішчыне [7, ф.295, воп.1, спр.701, арк. 33адв.]. Ёсць звесткі гэтага перыяду і аб храме ў в. Кірыліна [7, ф. 136, воп. 1, спр. 7963, арк. 117].

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і ўваходжання беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі прававое становішча старавераў значна пагоршылася. Так, у Расіі на працягу XVIII ст. было выдадзена шэраг указаў і пастаноў, якія абмежоўвалі ці ўвогуле забаранялі староверскае храмабудаўніцтва. Падобныя ўказы выходзілі і ў першай палове XIX ст. Так, у 1817 г. быў прыняты ўказ аб забароне будаўніцтва стараверскіх храмаў. А Камітэт Міністраў яшчэ раз пацвердзіў мясцовым уладам "о строжайшем наблюдении, дабы вновь таковыя заведения отнюдь не были учреждаемы" [24, с. 52]. Замацаванне забароны на будаўніцтва стараверскіх храмаў адбылося ў 1820-я гг. Так, у 1822 г. былі зацверджаны правілы, згодна з якімі старaверам у Расійскай імперыі забаранялася будаваць новыя храмы. Пры гэтым ізноў пацвярджалася, што ранейпабудаваныя храмы пакідаліся "без разгляду" [24, с. 69]. У 1826 г. імператар пацвердзіў дзейнасць гэтых правіл. Стараверам па-ранейшаму не дазвалялася нічога будаваць, падобнае на царкву, але пры гэтым рэкамендавалася не рабіць ім "прыцясненняў" і існуючыя малельні пакінуць [24, с. 89]. Гэта пацвярджэнне было даволі важным, а 1826 г. стаў прынцыповай мяжой. У афіцыйных дакументах сярэдзіны XIX ст. пры згадках аб дзеючых стараверскіх храмах часта дадавалася "построена до 1826 г." Таксама ў гэтым жа годзе было выдадзена прадпісанне "собрать сведения везде о всех молельнях, и часовнях и проч., по сколь можно безгласно" [24, с. 88]. А ў 1827 г. было выдадзена распараджэнне аб забароне на ўсялякі рамонт і аднаўленне стараверскіх храмаў [24, с. 88].

Ужо ў 1820-х гг. на беларускіх землях фіксуюцца выпадкі закрыцця ("запячатвання") стараверскіх храмаў. Так, у 1823 г. была запячатана маленная ў Відзах. У якасці прычын, якія ўказваліся на закрыццё стараверскага храма было тое, што стараверскі святар "отвернул от православной церкви" некаторых праваслаўных і перахрысціў іх (многія з якіх раней былі стараверамі, але перайшлі ў праваслаўе) [7, ф. 136, воп. 1, спр. 7963, арк. 84–84адв.]. А Браслаўскі земскі суд у гэтым жа годзе нават пастанавіў "уничтожить" храм па прычыне таго, што яго наяўнасць будзе спакушаць пераходзіць мясцовае насельніцтва ў "раскол". У дакументах таго часу ўпамінаюцца некалькі выпадкаў аб пераходзе ў "раскол" мясцовых праваслаўных. Усё гэта стала падставай для запячатвання маленнай [7, ф. 136, воп. 1, спр. 7963, арк. 14-15, 61, 66]. Але, як вынікае з дакументаў, у хуткім часе маленная была распячатана і там былі дазволены багаслужэнні [27, f. 380, ap.121, b. 140, l. 14–15].

Правядзенне рэпрэсійнай палітыкі ў адносінах да стараверскіх храмаў суправаджалася, разам з тым, строгім іх адсочваннем, таму звесткі аб іх з гэтага часу становяцца больш аб'ёмнымі. Аналізуючы даныя аб колькасці стараверскіх храмаў у 1830 – 1840-я гг. на беларускіх землях, варта адзначыць іх вялікую колькасць, у тым ліку і ў паўночна-заходнім рэгіёне. Так, у межах Віленскай губерні на 1835 г. налічвалася 20 храмаў, у 1840 г. – 14, а ў 1846 г. – 10 (табліца 1). Такое заўважнае памяншэнне колькасці храмаў у межах Віленскай губерні з 1840 г. па 1846 г. не абумоўлена выключна рэпрэсіўнай палітыкай царскіх уладаў у адносінах старавераў. Справа ў тым, што ў 1842 г. з сямі паўночных паветаў Віленскай губерні была ўтворана Ковенская губерня, таму шэраг стараверскіх арэалаў апынуліся ўжо ў межах Ковенскай губерні. У сваю чаргу, у тым жа 1842 г. да Віленскай губерні былі далучаны некаторыя паветы Гродзенскай і Мінскай губерняў, дзе таксама пражывалі стараверы (асабліва ў Дзісенскім павеце былой Мінскай губерні).

У некаторай ступені сітуацыя памянялася ў 1860-х гг. Для гэтага перыяду характэрна паслабленне рэпрэсій у адносінах да старавераў на паўночна-заходніх беларускіх землях. З-за іх удзелу ў падаўленні паўстання 1863 г. царскі ўраз зрабіў

некаторыя паслабленні ў бок стараавераў рэгіёна. Так, у 1863 г. была "распячатана" маленная ў в. Кублішчына Дзісенскага павета [24, с. 599], а ў Новааляксандраўскім павеце, як сведчаць афіцыйныя даныя, былі адчынены (пабудаваныя) ў 1864 г. храмы у Відзах і Кірыліна [19, с. 389].

Табліца 1. – Колькасць стараверскіх храмаў па беларускіх губернях (1835–1846 гг.).

| Год | Колькасць стараверскіх храмаў па губернях | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Магілёўская | Віленская | Віцебская | Мінская | Ковенская |
| 1835 | 10 цэркваў (усе ў Беліцкім павеце), 17 капліц, 5 мужчынскіх і 2 жаночыя манастыры | 20 капліц | 19 капліц і 19 малітоўных дамоў | 4 капліцы | Губерня была арганізавана толькі ў 1842 г. |
| 1840 | 11 цэркваў, 20 капліц і малельняў без прастолаў, 4 манастыры (мужч.) | 14 капліц і малельняў без прастолаў | 21 капліц і малельняў без прастолаў | 6 капліц і малельняў без прастолаў | |
| 1846 | 2 манастыры мужч., 2 манаст. жаноч., 8 маліт. будынкаў з прастоламі, 19 маліт. буд. без прастолаў | 10 капліц і малельняў без прастолаў | 35 капліц і малельняў без прастолаў | 5 капліц і малельняў без прастолаў | 9 капліц і малельняў без прастолаў |

Складзена аўтарам на аснове [1, с. 283, 284, 449]

Сур'ёзныя змены ў адносінах да стараверскага храмабудаўніцтва прынёс закон (Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета) "О даровании раскольникам некоторых прав гражданских и по отправлению духовных треб" ад 3 мая 1883 г. Згодна з ім, стараверы атрымалі шэраг грамадзянскіх правоў. Разам з тым, закон прадугледжваў шэраг паслабленняў і ў адносінах стараверскіх храмаў. Так, стараверам дазвалялася "исправлять и возобновлять" храмы, якія разбураліся. Таксама дазвалялася распячатванне стараверскіх храмаў (за выключэннем манастыроў і скітоў). Пры гэтым адзначалася, што новаўтвораны храм не павінен быць падобным на праваслаўную царкву і не мець званоў. Пры гэтым, не забаранялася на стараверскіх храмах устанаўліваць наддзверныя іконы і крыжы [20, с. 219–220].

Як вынікае з аналізу крыніц, у канцы XIX – пачатку XX ст. колькасць стараверскіх храмаў на беларускіх землях істотна вырасла. Аднак у паўночна-заходнім рэгіёне асабліва істотнага павелічэння стараверскіх храмаў ў 1880-я гг. (пасля ўказу 1883 г.) не назіраецца. А вось у 1890-я гг. гэта заўважна. У навуковых працах сустракаецца меркаванне, што павелічэнне колькасці стараверскіх храмаў на беларускіх землях напрамую звязана з указам 17 красавіка 1905 г. "Об укреплении начал веротерпимости", у адпаведнасці з якім стараверам, як і прадстаўнікам іншых канфесій, дазвалялася без усякага дазволу будаваць храмы і адчыняць свае прыходы. Аднак, як паказваюць матэрыялы з Віленскай губерні, асноўнае павелічэнне колькасці стараверскіх малельняў адбылася яшчэ да прыняцця гэтага ўказа. Так, згодна са статыстычнымі данымі, у 1879 г. у Віленскай губерні налічвалася 10 стараверскіх маленных.

Да пачатку 1890-х гг. такая колькасць заставалася амаль нязменнай (з павелічэннем на адну да 11, або зноў змяншэннем да 10). У 1891 г. у губерні налічвалася 11 малельняў старавераў, у 1892 г. – 12, у 1893 г. – 15, у 1895 г. – 15, у 1896 г. – 18. А ў 1897 г. іх колькасць дасягнула 22. З іх у г. Друі – 1, Дзісенскім павеце – 8, Ашмянскім павеце – 2, Свянцянскім павеце (без г. Свянцяны) – 4. Такім чынам, з 1891 г. па 1897 г. колькасць стараверскіх маленных у Віленскай губерні павялічылася ў два разы. У той жа час рост колькасці стараверскіх храмаў у губерні ў пачатку XX ст. не быў такім істотным. Так, у 1906 г. у губерні іх налічвалася 23, у 1907 г. – 25, а у 1911 г. дзейнічала 26 храмаў. Пры гэтым, на беларускіх землях колькасць маленных змянілася яшчэ менш. На 1907 г. налічвалася 1 малельня ў г. Друя, 8 – у Дзісенскім павеце, 2 – у Ашмянскім павеце, 5 – у Свянцянскім павеце (без г. Свянцяны). Амаль такая ж карціна характарная і для 1911 г.: 1 малельня у г. Дзісна, 9 – у Дзісенскім павеце, 2 – у Ашмянскім павеце, 5 – у Свянцянскім павеце (без г. Свянцяны) [8, с. 16; 9, с. 20; 10, с. 19; 11, с. 31; 12, с. 39; 13, с. 33; 14, с. 44; 15, с. 48; 16, с. 49; 17, с. 54].

Сур'ёзныя змены ў дачыненні стараверскага храмабудаўніцтва ў пачатку XX ст. прынеслі ўказы ад 17 красавіка 1905 г. "Об укреплении начал веротерпимости" і ад 17 кастрычніка 1906 г "О порядке образования и действия старообрядческих общин". Гэтыя ўказы істотным чынам палепшылі прававое становішча стараверaў у Расійскай імперыі. Пазітыўным чынам яны сказаліся і на стараверскіх храмах. Так, згодна з Указам 1905 г. стараверам дазвалялася будаўніцтва і рамонт культавых пабудоў на тых жа ўмовах, што і "инославных исповеданий" (п. 8). Таксама ўказ прадпісваў распячатванне ўсіх раней зачыненых малітоўных дамоў (п. 12), а таксама ўстанавіў агульныя правілы для пабудовы і рамонту цэркваў і малітоўных дамоў усіх хрысціянскіх канфесій (п. 13) [21]. Згодна з указам 1906 г. "Сооружение храмов, молитвенных домов, скитов и обителей разрешается старообрядцам губернаторами или градоначальниками. Для выдачи означенных разрешений необходимо: а) постановление общего собрания членов общины с ходатайством относительно предположенной постройки, и б) соблюдение в представляемом проекте испрашиваемой постройки технических требований устава строительного" [5]. Такім чынам, гэтыя прававыя акты адмянялі раней існуючыя абмежаванні ў пытаннях функцыянавання, адкрыцця, рамонту стараверскіх храмаў.

Перыяд 1920 – 1930-х гг. быў дастаткова спрыяльным у гісторыі старaверства ў заходняй частцы Беларусі, якая ў гэты час знаходзілася ў складзе Польшчы. Нягледзячы на тое, што ў польскай дзяржаве ў гэты перыяд прыярытэтнае развіццё атрымаў каталіцкі касцёл, становішча іншых канфесій было дастаткова нядрэнным. Стараверская царква развівалася ў адносна спрыяльных умовах, што прывяло да росту колькасці абшчын і іх вернікаў. Такое становішча праявілася і ў сферы храмабудаўніцтва. Менавіта міжваенныя гады сталі перыядам росквіту стараверскага храмабудаўніцтва ў рэгіёне. Аналіз крыніц паказаў, што на прыканцы 1930-х гг. у паўночназаходнім рэгіёне Беларусі функцыянавала 30 стараверскіх храмаў. Геаграфія іх размяшчэння прадстаўлена на малюнку 1.

Паколькі значная частка стараверскіх храмаў рэгіёна была пабудавана яшчэ ў канцы XIX – пачатку XX ст., то ў міжваенны перыяд стан многіх з іх быў даволі дрэнным. Шэраг гэтых храмаў у 1920 – 1930-я гг. быў сур'ёзна перабудаваны і адрамантаваны. Архіўныя крыніцы пераканаўча сведчаць аб тым, што ў міжваенны перыяд амаль усе стараверскія храмы ў рэгіёне зведалі калі не істотныя перабудовы, то сур'ёзныя рамонтныя работы. Аналіз крыніц і натурныя абследаванні храмаў паказалі, што менавіта ў гэты перыяд і былі сфарміраваны архітэктурныя вобразы большасці пабудоў, якія захаваліся да нашага часу.




*Ашмянскі раён:* 1. Гедэйкі, 2. Новая Слабада.
*Валожынскі раён:* 3. Масцішча.
*Астравецкі раён:* 4. Стрыпішкі.
*Мядзельскі раён:* 5. Свір.
*Пастаўскі раён:* 6. Апідамы, 7. Кукляны, 8. Захараўшчына, 9. Лучай.
*Браслаўскі раён*: 10. Відзы, 11. Астровішкі, 12. Грыгараўшчына, 13. Мінкавічы, 14. Мікалаюнцы, 15. Рымуці, 16. Булавішкі, 17. Лаўнікі, 18. Мацешы, 19. Буеўшчына, 20. Кірыліна, 21. Друя.
*Міёрскі раён:* 22. Ніўнікі, 23. Кублішчына.
*Шаркаўшчынскі раён:* 24. Барсучына, 25. Ерзаўка, 26. Варонка, 27. Ракаўцы, 28. Германавічы.
*Глыбоцкі раён:* 29. Ластавічы, 30. Залессе.

**Малюнак 1. – Стараверскія храмы на заходнебеларускіх землях у другой палове 1930-х гг. (складзена аўтарам, адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел прадстаўлены на сучасны стан)**

Вялікая Айчынная вайна прынесла вялікія спусташэнні на беларускія землі. Яны датычыліся і храмаў старавераў. Крыніцы прадстаўляюць значную колькасць прыкладаў спаленых старaверскіх храмаў падчас вайны. Так, храм у в. Рымуці быў знішчаны яшчэ ў 1941 г. акупантамі [2, ф. 1439, воп. 3, спр. 145, арк. 15–16адв]. А царква ў в. Мацешы згарэла ў 1944 г. [6, ф. 952, воп. 1, спр.19, арк. 10]. Стараверская маленная ў в. Грыгараўшчына згарэла ў 1942 г. Як вынікае з крыніц, яе падпалілі злодзеі, што абрабавалі храм [23, с. 256]. Як вынікае з успамінаў рэспандэнтаў, храм у Друі таксама згарэў падчас вайны.

Нягледзячы на цяжкія гады Вялікай Айчыннай вайны, у пасляваенны перыяд у рэгіёне налічвалася значная колькасць стараверскіх храмаў. Пры гэтым трэба адзначыць, што у самыя першыя гады пасля вызвалення беларускіх земляў ад нямецкіх захопнікаў іх дакладнага падліку не вялося, таму афіцыйная статыстыка першых пасляваенных гадоў прадстаўляе некалькі меншую колькасць цэркваў. Згодна з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам таго часу, тэрыторыя рэгіёна адносілася да Полацкай і Маладзечанскай абласцей. Толькі ў межах Полацкай вобласці на 1 ліпеня 1949 г. дзейнічала 16 стараверскіх абшчын, 2 з якіх размяшчаліся ў прыватных дамах, а 14 – у асобных храмах [6, ф. 952, воп. 2, спр. 19, арк. 174]. У Маладзечанскай вобласці на 1 ліпеня 1949 г. налічвалася 5 стараверскіх храмаў [6, ф. 952, воп. 2, спр. 19, арк. 208].

Нягледзячы на тое, што ў пасляваенны перыяд становішча стараверскіх абшчын у Заходняй Беларусі было непараўнальна лепшым, чым ва Усходняй, усё ж значная частка храмаў была зачынена і перададзена пад іншыя патрэбы.

У 1961 г. быў праведзены ўлік рэлігійных аб’яднанняў па Віцебскай вобласці. У выніку было выяўлена 16 зарэгістраваных стараверскіх аб’яднанняў і 2 незарэгістраваныя (у Лучаі і Дзедушках) [2, ф. 4029, воп. 1, спр. 13, арк. 307]. На тэрыторыі Заходняй Віцебшчыны дзейнічала 15 абшчын (13 зарэгістраваных і 2 незарэгістраваныя), якія налічвалі 14 храмаў. Яшчэ адна незарэгістраваная абшчына ў в. Дзедушкі Браслаўскага раёна праводзіла багаслужэнні па хатах (табліца 2). Таксама, у межах рэгіёна па-ранейшаму дзейнічалі яшчэ 3 храмы на тэрыторыях, якія ў гэты перыяд адміністрацыйна ўжо адносіліся да Мінскай (в. Масцішча, пас. Свір) і Гродзенскай (в. Стрыпішкі) абласцей.

Табліца 2. – Стараверскія храмы ў заходняй частцы
Віцебскай вобласці па стане на 1961 г.

| Цэнтр абшчыны[15] | Характарыстыка малітоўнага дому |
|---|---|
| 1 | 2 |
| в. Апідамы Пастаўскага р-на | Драўляны (муніц.), 120, кв.м |
| в. Кукляны Пастаўскага р-на | Драўляны (муніц.),125, кв.м |
| в. Відзы Браслаўскага р-на | Цагляны, (муніц.), 464 кв.м. |
| в. Мікалаюнцы Браслаўскага р-на | Драўляны (муніц.), 80, кв.м |
| в. Мінкавічы Браслаўскага р-на | Драўляны (муніц.), 73, кв.м |
| в. Булавішкі Браслаўскага р-на | Драўляны (муніц.), 131, кв.м |
| в. Кірыліна Браслаўскага р-на | Драўляны (муніц.), 160, кв.м |
| в. Варонка Шаркаўшчынскага р-на | Драўляны (муніц.), 9Х14=126, кв.м |
| в. Ніўнікі Міёрскага р-на | Драўляны (муніц.), 105, кв.м |
| в. Ракаўцы Шаркаўшчынскага р-на | Драўляны (муніц.), 7Х10=70, кв.м |

[15] Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел прадстаўлены па стану на 1961 г.

Заканчэнне табліцы 2.

| 1 | 2 |
|---|---|
| в. Кублішчына Міёрскага р-на | Драўляны (муніц.), 16Х12=192, кв.м |
| в. Германавічы Шаркаўшчынскага р-на | Драўляны (муніц.), 9Х11=99, кв.м |
| в. Ластавічы Глыбоцкага р-на | Драўляны (муніц.), 75, кв.м |
| в. Дзедушкі Браслаўскага р-на | *Багаслужэнні ў дамах вернікаў* |
| в. Лучай Глыбоцкага р-на | Драўляны (муніц.), 100 кв.м |

Складзена аўтарам на аснове: [2, ф. 4029, воп. 1, спр. 13, арк. 256–273].

З пачатку 1990-х гг. колькасць стараверскіх храмаў у рэгіёне павялічваецца. Так, былі адчынены храмы ў Браславе, Друі, Буеўшчыне. На сучасным этапе на тэрыторыі рэгіёна функцыянуюць 18 стараверскіх храмаў. З іх 15 – у заходняй частцы Віцебскай вобласці, 2 – у Мінскай вобласці. Адзін храм у Гродзенскай вобласці (уроч. Стрыпішкі) на сучасным этапе існуе, але не функцыянуе. Таксама да нашых дзён захаваліся некаторыя будынкі, пераабсталяваныя з былых стараверскіх храмаў. Так, у в. Залессе і в. Мікуліна Глыбоцкага раёна захаваліся будынкі школ, якія былі перабудаваны з Залесскага і Лучайскага храмаў.

У наш час шэраг стараверскіх храмаў рэгіёна ўключаны ў "Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь" [3]. Але трэба заўважыць, што ў "Спісе…" у якасці стараверскіх храмаў Беларусі згаданыя толькі два: Свята-Ільінская царква ў г. Гомелі і Свята-Троіцкая царква ва ўрочышчы Стрыпішкі Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці (у Спісе пададзена ў якасці даты будаўніцтва XVIII – XIX стст.) [3, с. 228, 335].

У той жа час у "Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь" храмаў старавераў значна больш. Аднак ніякіх указанняў, што яны з'яўляюцца гісторыка-культурнай спадчынай стараверaў Беларусі, няма. Так, згодна са Спісам, гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі з'яўляюцца 9 аб'ектаў культавай архітэктуры рэгіёна. Апроч згаданага вышэй Свята-Троіцкага храма ў Стрыпішках, у Спіс уключаны наступныя аб'екты (далей прадстаўлена інфармацыя ў адпаведнасці са спісам): царква Успення Прасвятой Багародзіцы г.п. Відзы Браслаўскага раёна (1910); царква ў в. Кірыліна Браслаўскага раёна (пачатак XX ст.); Пакроўская царква ў в. Мінкавічы Браслаўскага раёна (пачатак XX ст.); царква ў в. Апідамы Пастаўскага раёна (XIX ст.); царква ў в. Варонка Шаркаўшчынскага раёна (пачатак XX ст.) (малюнак 2); царква ў в. Германавічы Шаркаўшчынскага раёна (пачатак XX ст.); Свята-Троіцкая царква ў в. Кублішчына Міёрскага раёна (пачатак XIX ст.); Успенская царква ў в. Ніўнікі Міёрскага раёна (пачатак XX ст.) (малюнак 3) [3].

Адразу ж трэба звярнуць увагу на шэраг памылак з вызначэннем дат будаўніцтва гэтых храмаў, прадстаўленых у выданні. Так, існуючы храм у в. Апідамы перабудаваны ў 1930-я гг. Будаўніцтва храма ў Германавічах ажыццяўлялася ў канцы 1920-х гг., а Свята-Троіцкая царква ў Кублішчыне (малюнак 4) была пабудавана ў канцы XIX і дабудавана ў пачатку XX ст. І зусім жа дзіўнай выглядае дата будаўніцтва храма ў Стрыпішках.

Аналізуючы прадстаўленасць стараверскіх храмаў у Спісе, варта адзначыць, што ў яго ўключаны пераважна тыя аб'екты стараверскага культавага дойлідства, згадка пра якія ёсць у «Зборы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» [4]. Іншыя ж аб'екты архітэктурнай спадчыны стараверaў не трапілі ў Спіс. Сярод іх Свята-Мікольская царква ў в. Мікалаюнцы Браслаўскага раёна, Свята-Пакроўская царква ў в. Булавішкі Браслаўскага раёна, Свята-Успенская царква в. Буеўшчына Браслаўскага раёна, Свята-Успенская царква в. Кукляны Пастаўскага р-на, Багаяўленская царква в. Ластавічы Глыбоцкага раёна, Свята-Успенская царква в. Масцішча Валожынскага раёна, Свята-Успенская царква ў пас. Свір Мядзельскага раёна.



**Малюнак 2. – Стараверская царква ў в. Варонка Шаркаўшчынскага р-на. Фота аўтара, 2022 г.**



**Малюнак 3. – Стараверская царква ў в. Ніўнікі Мёрскага р-на. Фота аўтара, 2008 г.**



**Малюнак 4. – Стараверская царква ў в. Кублішчына Мёрскага р-на. Фота аўтара, 2020 г.**

Сярод аб’ектаў храмавай архітэктуры старавераў-беспапоўцаў Паўночна-Заходняй Беларусі вылучаюцца дзве групы: мураваныя храмы і драўляныя. Нягледзячы на шматлікія адрозненні ў знешнім афармленні і інтэр’еры, храмы беспапоўцаў рэгіёна пры гэтым вельмі блізкія адзін да аднаго. Усё гэта абумоўлена асаблівасцямі веравучэння старавераў-беспапоўцаў. Так, згодна хрысціянскай традыцыі храм павінен уяўляць выцягнутую пабудову (“карабель”), якая складаецца з алтара, памяшкання для малення і прытвора. Аднак у беспапоўцаў з-за адсутнасці святарства і немагчымасці праводзіць літургію храмы не мелі алтарнай часткі. Таму комплекс храма мусіць уключаць толькі малітоўны зал і прытвор. Такім чынам храмы старавераў-беспапоўцаў рэгіёна ў архітэктурным плане вельмі блізкія паміж сабой. У большасці сваёй, яны ўяўляюць прамавугольную ў плане пабудову падоўжана-восевай кампазіцыі, якая ўключае два памяшканні (малітоўны зал і прытвор). Усе храмы арыентаваны па лініі «захад – усход» (бываюць з невялікім адхіленнем).

Як ужо было адзначана вышэй, за ўвесь перыяд на тэрыторыі Паўночна-Заходняй Беларусі зафіксавана значная колькасць стараверскіх храмаў. Іх падлік паказаў, што яны знаходзіліся ў каля 40 населеных пунктах рэгіёна (без уліку выпадкаў пераноса храма адной абшчыны ў іншую вёску). Найбольшая колькасць (30 храмаў) у рэгіёне адначасова функцыянавала ў 1930-я гг. Як ужо было адзначана, значная іх частка ў сучасны перыяд не існуе, а крыніцы па некаторых утрымліваюць вельмі сціслую інфармацыю. Шэраг аб’ектаў, якія існуюць у сучасны перыяд, былі пабудаваны толькі ў пачатку 1990-х гг. Некаторыя з іх былі перабудаваны з існуючых жылых ці грамадскіх будынкаў (напрыклад, храмы ў Браславе, аг. Друя Браслаўскага раёна). А таму на фарміраванне іх архітэктурнага аблічча паўплываў характар пер-

шапачатковай пабудовы. Пры гэтым, усё ж, трэба заўважыць, што пабудаваныя (ці перабудаваныя з жылых і грамадскіх будынкаў) у другой палове XX – пачатку XXI ст. храмы (г. Браслаў, в. Буеўшчына, аг. Друя) у пларіроўцы і аб'ёме адпавядаюць традыцыям храмабудаўніцтва старавераў-беспапоўцаў на беларускіх землях.

Найбольшую колькасць старaверскіх беспапоўскіх храмаў уяўляюць аб'екты, пабудаваныя з дрэва. Увогуле, да пачатку XX ст. у беспапоўцаў рэгіёна існавалі толькі драўляныя храмы. І толькі з пачатку XX ст. з'явіліся мураваныя. На вялікі жаль, крыніцы канца XVIII – першай паловы XIX ст. мала паведамляюць аб знешнім выглядзе храмаў старавераў-беспапоўцаў рэгіёна. Але і з існуючых згадак становіцца зразумела, што стараверскія малітоўныя дамы рэгіёна яшчэ ў першай палове XIX ст. мелі элементы, якія ўказвалі на сакральны статус пабудовы. Да іх, у першую чаргу, адносіліся крыжы і званіцы. Так, стараверскі храм у 1820-я гг. у Відзах характарызаваўся наступным чынам: "В оном городе имеют свои сходбища по часовни на подобие церкви выстроенную с колоколами" [7, ф. 136, воп. 1, спр. 7963, арк. 84адв].

На працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст. храмы старавераў у архітэктурным плане істотным чынам абмяжоўваліся законам. Было дазволена функцыянаванне толькі храмаў без «оказательства» (без купала, званіцы і крыж, г.зн. без элементаў, якія ўказваюць на культавы характар пабудовы). А таму доўгі час стараверскія храмы знешне не нагадвалі пабудовы культавага характару. У крыніцах гэтага часу пастаянна знаходзім характарыстыку знешніх асаблівасцей стараверскіх маленных з пазнакай, што яны не адрозніваюцца ад сялянскіх хат. Закон ад 3 мая 1883 г. хоць і дазваляў на храмах старавераў усталёўваць наддзверныя іконы і крыжы, але па-ранейшаму не дазваляў іншыя знешнія праявы храма. Менавіта з-за гэтага доўгі час у канцы XIX ст. не ўдавалася атрымаць дазвол вернікам Кублішчанскай абшчыны на будаўніцтва свайго храма. Прадстаўлены праект нагадваў праваслаўную царкву. І толькі пасля ўказу 1905 г. стараверам дазвалялася будаваць свае малельні са знешнімі праявамі храма (з крыжамі, купаламі, званіцай).

Большасць драўляных храмаў старавераў-беспапоўцаў рэгіёна адназрубныя. У іх усе часткі аб'яднаны ў адным вялікім прамавугольным зрубе з дапамогай прыёму зрошчвання брусоў у адной плоскасці. Як намі адзначалася, у стараверскіх беспапоўскіх храмах Паўночна-Заходняй Беларусі няма алтарнай апсіды, таму ўсходняя частка пабудовы заканчваецца глухой сцяной. Некаторыя храмы складаюцца з двух зрубаў (да чатырохсцена далучаны трысцен). Зруб, як правіла, пастаўлены на стужкавы падмурак, складзены з бутавага (радзей часанага) каменю на растворы. Большасць цэркваў зрублены ў "чысты" (нямецкі) вугал. З ацалелых да нашага часу стараверскіх храмаў рэгіёна толькі ў маленных у в. Ластавічы Глыбоцкага раёна (малюнак 5) і в. Германавічы Шаркаўшчынскага раёна (малюнак 6) зруб "з астаткам".

Памеры стараверскіх храмаў рэгіёна, як правіла, невялікія. У пераважнай ступені гэта абумоўлена тым фактам, што большасць цэркваў размяшчалася ў сельскай мясцовасці, дзе колькасць вернікаў не была такой вялікай. Як вынікае з аналізу матэрыялаў сярэдзіны XX ст., памеры ацалелых на той час храмаў рэгіёна вагаліся ад 70 м$^2$ да 130 м$^2$. Толькі цэрквы ў в. Кірыліна Браслаўскага раёна (160 м$^2$) і в. Кублішчына Мёрскага раёна (192 м$^2$) вылучаліся сваімі параметрамі [2, ф. 4029, воп. 1, спр. 13, арк. 256–273].

Большасць храмаў рэгіёна накрыта двусхільным дахам. У шэрагу святынь старавераў Паўночна-Заходняй Беларусі дах мае залобак, калі ўсходні франтон усечаны зверху невялікім схілам (в. Масцішча Валожынскага раёна, пас. Свір Мядзельскага раёна, в. Кукляны Пастаўскага раёна). Як вынікае з аналізу геаграфічнай спецыфікі формы дахаў, яна адпавядае форме даху жылых пабудоў рэгіёнаў.



Малюнак 5. – Стараверская царква ў в. Ластавічы Глыбоцкага р-на. Фота аўтара, 2020 г.



Малюнак 6. – Стараверская царква ў в. Германавічы Шаркаўшчынскага р-на. Фота аўтара, 2022 г.

Пасля 1905 г. у храмах стараверaў-беспапоўцаў Паўночна-Заходняй Беларусі найбольш выразнай рысай, а часам, і адзінай, якая ўказвае на культавы характар аб’екта, з’яўляецца вежа-званіца. Яна размяшчаецца ў заходняй частцы храма з боку галоўнага фасаду. У стараверскіх храмах рэгіёна званіца прадстаўлена двума варыянтамі: першы – калі яна надбудавана над каньком даху (як бы “вырастае” з яго); другі – калі вежа-званіца прымыкае (прыбудавана) да плоскасці заходняга фасаду. Як сведчаць апісанні і ілюстрацыйныя крыніцы, нават пасля 1905 г. шэраг храмаў стараверaў-беспапоўцаў па-ранейшаму званіц не меў. У іх з боку галоўнага (заходняга) фасаду над каньком размяшчаўся васьміканцовы крыж. З ацалелых да нашага часу храмаў вежа-званіца адсутнічае ў маленнай в. Ластавічы Глыбоцкага раёна. Замест яе на каньку ў заходняй частцы храма размешчана глаўка на тонкім барабане.

У храмах стараверaў-беспапоўцаў Паўночна-Заходняй Беларусі найбольш пашыраны першы варыянт – з надбудаванай над галоўным фасадам вежай. Як правіла, яна мае адзін ці два ярусы і завяршаецца невялікай глаўкай. Двух’ярусная вежа часцей выканана ў выглядзе васьмерыка на чацверыку з шатровым завяршэннем і купалком (вв. Варонка і Германавічы Шаркаўшчынскага раёна, вв. Кублішчына і Ніўнікі Міёрскага раёна і інш.). У храме ў пас. Свір Мядзельскага раёна характэрны варыянт “васьмярык на васьмярыку”. Сустракаецца варыянт двух’яруснай вежы “чацвярык на чацвярыку” (в. Кукляны Пастаўскага раёна). У некаторых храмах вежа была выканана аднаярусная ў форме чацверыка з шатровым завяршэннем і невялікай глаўкай (в. Стрыпішкі Астравецкага раёна, сучасны выгляд храма ў в. Кірыліна Браслаўскага раёна).

Даволі распаўсюджаны таксама і варыянт вежы-званіцы, якая прыбудавана (прымыкае) да плоскасці заходняга фасада. Да гэтай групы адносяцца храмы ў в. Мікалаюнцы Браслаўскага раёна, в. Лучай Пастаўскага раёна (не захаваўся), в. Масцішча Валожынскага раёна, в. Апідамы Пастаўскага раёна і інш. У адным выпадку (в. Булавішкі Браслаўскага раёна) вежа прыбудавана да галоўнага ўвахода, які размяшчаецца не з заходняга боку, а з паўднёвага, у сярэдзіне даўжыні храма. У в. Апідамы і в. Масцішча чацвярык званіцы не проста прымыкае да заходняга фасада, але непасрэдна “ўрэзаны” ў яго канструкцыю.

У большасці святынь маецца і другая невялікая вежачка, размешчаная над усходняй часткай. Яна, як правіла, аднаярусная ў форме чацверыка ці васьмерыка, з невялікай цыбулепадобнай ці паўкруглай глаўкай. У некаторых храмах меншай вежачкі ва ўсходняй частцы не было (в. Стрыпішкі Астравецкага раёна, в. Кукляны Пастаўскага раёна), або яе замяняў крыж (выгляд храма ў в. Мінкавічы Браслаўскага раёна ў міжваенны перыяд).

Планіроўка драўляных храмаў стараверaў-беспапоўцаў Паўночна-Заходняй Беларусі даволі аднатыпная. Як правіла, яна ўключае два памяшканні, пастаўленыя адно за адным па адной восі: прытвор – заходняя частка і малітоўная зала – усходняя частка. Іх памеры не аднолькавыя (прытвор значна меншы). У прасторы прытвору нярэдка вылучаліся асобныя памяшканні (“келлі”): месца для хрышчэння, келля святара і інш. З прытвора выходзяць адны ці двое дзвярэй (апошні варыянт больш распаўсюджаны і абумоўлены традыцыяй раздзельнага малення мужчын і жанчын), якія вядуць у малітоўную залу. У прытворы таксама размяшчаецца лесвіца на званіцу і хоры (калі яны маюцца). Храмы стараверaў-беспапоўцаў Паўночнай Беларусі не мелі скляпенняў. У большасці іх падшывалася звычайная плоская столь. У шэрагу выпадкаў у малітоўнай зале яна была скругленай, плаўна пераходзячы ў вертыкальную плоскасць сцен.

Ва ўсіх беспапоўскіх цэрквах адсутнічае алтар. Паколькі ў храмах старавераўбеспапоўцаў літургію не служаць і сакрамант эўхарыстыі не адбываецца, то алтар адсутнічае. На ўсходняй сцяне маленнай, якая выконвае функцыю іканастаса, размяшчаюцца іконы. Як сведчаць сучасныя натурныя абследаванні і фотаздымкі сярэдзіны XX ст., яны часцей ўстанаўліваюцца на паліцах, размешчаных уздоўж сцяны. Такім чынам, у стараверскіх храмах іканастас закрывае сцяну, але не алтар.

Перад іканастасам размяшчаецца салея, узнятая на невялікую вышыню над агульным узроўнем падлогі. Усярэдзіне яна паўкругам высунутая ў бок малельнай залы. Па цэнтры салеі бліжэй да ўсходняй сцяны мог размяшчацца прастол. Крыніцы XIX – пачатку XX ст. сведчаць, што не ва ўсіх храмах стараверaў-беспапоўцаў Паўночна-Заходняй Беларусі былі прастолы. Доўгі час іх увогуле забаранялася ўстанаўліваць. У адпаведнасці з указам ад 28 красавіка 1836 г. “О воспрещении обращать крестьянские избы в старообрядческие молельни и устраивать в молельнях престолы” старaверам забаранялася ўсталёўваць у храмах прастолы, якія разглядаліся як элемент выключна праваслаўных (сінадальных) цэркваў. Але пры гэтым указ дазваляў захаваць тыя прастолы, “коих существование дозволено на основании законов” [24, с. 170]. У сучасны перыяд усе стараверскія беспапоўскія храмы рэгіёна маюць прастолы. Як сведчаць сучасныя натурныя абследаванні і ілюстрацыйныя крыніцы, прастол ўяўляе сабой стол, які ўзвышаецца на пастаменце ў адну ці некалькі прыступак над салеяй. За ім устаноўлены вялікі драўляны крыж. На прастоле размяшчаецца Евангелле і храмавы абраз (у шэрагу выпадкаў абразоў два – яны размяшчаюцца справа і злева ад прастола на асобных аналоях). Часам на прастол ускладалі і іншыя рэчы (невялікія медныя крыжы і іконы, богаслужбовыя кнігі і г.д.).

Па баках салеі размяшчаюцца два кліpасы (“крыласы”, як часта называюць прыхажане) – левы і правы. Кліpасы аддзелены ад малельнай залы невысокай перагародкай (глухой ці ў выглядзе рашоткі). На кліpасе знаходзяцца ў час богаслужэння святар (“настаўнік”) і “кліpашане” (тыя, хто чытаў малітвы і спяваў).

Уся прастора малітоўнай залы падзелена на дзве часткі: “мужчынскую” (правую) і “жаночую” (левую). У ходзе богаслужэння мужчыны і жанчыны моляцца асобна. У большасці храмаў у кожную з гэтых частак вядуць свае дзверы. Для размежавання гэтых частак маглі выкарыстоўваць печку, невялікую перагародку (а часам і на ўсю вышыню залы) ці пастаўленую лаву. У сучасны перыяд такі падзел часта нічым не адзначаны і з’яўляецца ўмоўным. Сама традыцыя раздзельнай малітвы мужчын і жанчын вядомая з даўніх часоў, але ў сучасны перыяд у рэгіёне сярод хрысціянскага насельніцтва захоўваецца толькі ў старавераў.

Такім чынам, за працяглы перыяд пражывання на беларускіх землях у стараверскага насельніцтва сфарміравалася ўнікальная культура, якая стала неад’емнай часткай агульнай культурнай спадчыны краіны. З усяго комплексу гісторыка-культурных каштоўнасцей рускіх старавераў асобнае месца займаюць аб’екты храмавага дойлідства. Яны не толькі вылучаюцца сваёй унікальнасцю, але і маюць істотны патэнцыял для выкарыстання ў сферы турызму, адукацыйнай і выхаваўчай рабоце.

ЛІТАРАТУРА


1. Варадинов, Н. В. История Министерства внутренних дел : [Ч. 1-3] / [Соч.] докт. прав и философии Н. Варадинова. – СПб. : тип. М-ва внутр. дел, 1858-1863. – 8 т. 8-ая, дополнительная книга: История распоряжений по расколу. – 1863. – [2], VI, IV, 656 с.
2. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ).

3. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь / склад. В. Я. Абламскі, І. М. Чарняўскі, Ю. А. Барысюк. – Мінск : БЕЛТА, 2009. – 684 с.
4. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць. – Мінск : БелСЭ, 1985. – 496 с.
5. Именной высочайший Указ. О порядке образования и действия старообрядческих и сектантских общин и о правах и обязанностях входящих в состав общин последователей старообрядческих согласий и отделившихся от православия сектантов. – М. : Тип. П. П. Рябушинского, [1906]. – 24 с.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ).
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ).
8. Обзор Виленской губернии за 1879 год. - Вильна: Губ. тип., 1880. - [3], 34, [33] с.
9. Обзор Виленской губернии за 1891 год. - Вильна: Губ. тип., 1892. - [4], 52, [1] с.
10. Обзор Виленской губернии за 1892 год. - Вильна: Губ. тип., 1893. - [4], 53, [1] с.
11. Обзор Виленской губернии за 1893 год. - Вильна: Губ. тип., 1894. - [4], 69, [1] с.
12. Обзор Виленской губернии за 1895 год. - Вильна: Губ. тип., 1896. - [4], 73, [37] с.
13. Обзор Виленской губернии за 1896 год. - Вильна: Губ. тип., 1897. - [4], 74, [55] с.
14. Обзор Виленской губернии за 1897 год. – Вильна: Губ. тип., 1898. – [4], 98, [55] с.
15. Обзор Виленской губернии за 1906 год. - Вильна: Губ. тип., 1907. - [4], 96, [61] с.
16. Обзор Виленской губернии за 1907 год. - Вильна: Губ. тип., 1908. - [4], 98, [61] с.
17. Обзор Виленской губернии за 1911 год. – Вильна: Губ. тип., 1913. – [4], 102, [77] с.
18. Овсейчик, В. Е. К вопросу о расселении старообрядцев в северо-западном регионе Беларуси во второй половине XVII – первой половине XVIII в. / В. Е. Овсейчик // Вестник антропологии. – 2025. – № 1. – С. 337–352.
19. Памятная книжка Виленского генерал-губернаторства на 1868 г. / Ред. А. М. Сементовский. – СПб. : Тип. К. Вульфа. – [4], II, 499 с.
20. Полное собрание законов Российской империи: Собрание 3-е. – СПб. : Гос. тип. – Т. 3: 1883: от № 1293–1933 и дополнения. – 1886. – 979 с.
21. Полное собрание законов Российской империи: Собрание 3-е. – СПб. : Гос. тип. – Т. 25, отделение 1: 1905: от № 25605–27172 и дополнения. – 1908. – [2], 966, 157 с.
22. Поташенко, Г. Староверие в Литве: Вторая половина XVII – начало XIX вв. Исследования, документы, материалы / Г. Поташенко. – Вильнюс : Aidai, 2006. – 543 с.
23. Сиринъ. Староверская хрестоматия / Сост. и автор отдельных глав В. С. Михайлов. – Вильнюс : Древлеправославие. Слово и книга, 2005. – 399 с.
24. Собрание постановлений по части раскола. – 2-е изд., испр. и доп. – СПб. : Тип. МВД, 1875. – [4], 694, 65 с.
25. Breslaujos dekanato vizitacija 1782–1783 m., atlikta Vilniaus vyskupo Ignoto Jokūbo Masalskio parėdymu / Firkovičius, Romualdas, parengė [edt]. – Vilnius : Katalikų akademija, 2008. – XI, 464 p.
26. Lietuvos centrinis valstybės archyvas (Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў; LCVA).
27. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы; LVIA).